ны для паэм «Голас сэрца» П.Броўкі, «Трыпутнік» К.Кірэенкі, «Варшаўскі шлях» А.Куляшова, «Паэма жніва» Н.Мацяш. Радзей Р. праяўляе сябе ў прозе, таму што ў ёй слаба выражаны інтанацыйны строй і эмацыянальнае гучанне: «Хатынская аповесць» А.Адамовіча, «Абеліск», «Мёртвым не баліць», «Знак бяды», «Аблава» В.Быкава, «Вечар» А.Дударава, «Суд у Слабадзе» В.Казько, «Тартак» І.Пташнікава, «Апошнія і першыя» Б.Сачанкі.

**РЭ́КВІЕМ** (ад лац. requies спакой) у музыцы, жалобная памінальная меса. Назва ад першых лац. слоў «Requiem aeternam dona eis, Domine» («Вечны спакой даруй ім, Божа»). Ад урачыстай каталіцкай месы Р. адрозніваецца адсутнасцю некаторых частак («Глорыя», «Крэда»), замест якіх уводзяцца інш. «Туба мірум», «Лакрымоза»). Р. існаваў у Беларусі ў якасці кананічнай меладыйнай формы, звязанай са стараж. грыгарыянскай традыцыяй і ў тыповай для стылю эпохі гамафонна-гарманійнай інтэрпрэтацыі. Да жанру Р. звярталіся прафес. бел. кампазітары: Л.Шлег (рэквіем «Памятайце!», 1980), А.Залётнеў («Чарнобыльскі рэквіем» для дзіцячага і муж. хораў, аргана і ударных, 1999), С.Бельцюкоў («Чарнобыльскі рэквіем» на кананічны лац. тэкст, 2006) і інш. *І.У.Пілатава.*

**РЭКРЭАЦЫЙНАЯ АРХІТЭКТУ́РА**, галіна архітэктурнай дзейнасці, якая накіравана на фарміраванне месцаў адпачынку, турызму, аматарскага спорту, аздараўлення ў прыродным асяроддзі. Развіваецца ў функцыянальным, атракцыйным, этнаграф. кірунках. Для аб'ектаў Р.а. функцыянальнага кірунку характэрна гарманічнае ўвядзенне забудовы ў ландшафт, кампазіцыйная ўзгодненасць архіт. і прыродных прасторавых форм. Функцыянальны кірунак таксама адлюстроўвае імкненне стварыць асяроддзе, якое падначалена зручнасці адпачынку. Яго адрознівае вял. колькасць тэрас, балконаў, лоджый, раскрыццё інтэр'ераў у прыроднае асяроддзе (санаторыі «Баравое» Докшыцкага, «Сосны» Магілёўскага, база адпачынку «Нарачанка» Мядзельскага р-наў і інш.). Атракцыйны кірунак выражаецца ў пошуку эфектыўных архіт. рашэнняў. Арыгінальнасць форм, незвычайнасць прасторавых кампазіцый архіт. збудаванняў садзейнічаюць прыцягненню турыстаў і адпачываючых (дзіцячыя аздараўленчыя комплексы «Брыганціна», «Ракета» ў Мінскім р-не і інш.). Этнаграф. кірунак праяўляецца ў выкарыстанні матываў традыц. нар. архітэктуры — драўляных зрубаў, гонтавых ці саламяных дахаў і інш. (рэсп. гарналыжны цэнтр «Сілічы», гарналыжны спарт.-аздараўленчы комплекс «Лагойск» у Лагойскім р-не і інш.). У Р.а. вял. ўвага надаецца малым ландшафтна-архіт. формам, якія выконваюць адначасова ўтылітарную і эстэтычную функцыі. *Г.А.Патаеў.*

**РЭЛІ́ГІЯ** (ад лац. religio набожнасць, святыня, прадмет культу), адна са сфер духоўнага і практычнага жыцця людзей, светаўспрыманне, сістэма вераванняў, каштоўнасцей і норм, засн. на ўпэўненасці ў існаванні звышнатуральнага свету і асобых існасцей (Бог, божаствы), якія вызначаюць лёсы свету і чалавека. Шматпланавасць і складанасць Р. паўплывалі на фарміраванне розных падыходаў да яе разумення (як абсалютнай каштоўнасці, спосабу рэалізацыі вышэйшых чалавечых якасцей і здольнасцей, інструмента сацыя-культ. кансалідацыі і кіравання людзьмі на аснове адзінства вераванняў і ўцягвання ў культавую практыку і арганізацыйныя структуры). Псіхолагі разглядаюць Р. як перажыванне асобага вопыту, які дапамагае пераадолець абмежаванасць чалавечага існавання. У тэалагічным сэнсе Р. — сувязь чалавека з Богам. Важным аспектам рэліг. светаўспрымання з'яўляецца стварэнне вобразна-сімвалічнай карціны свету. У структуру Р. ўваходзяць дактрынальныя, апавядальныя, рытуальныя, эмацыянальныя, этыка-прававыя, арганізацыйныя, матэрыяльныя (храмы, прадметы для здзяйснення рытуалаў) элементы.

Дахрысціянскі этап гісторыі бел. культуры адпавядае стадыям першабытных і політэістычных вераванняў (гл. ў арт. *Язычніцтва*). Значныя перамены ў развіцці культуры еўрап. народаў унесла *хрысціянства*. Пачатак хрысціянізацыі бел. княстваў адносіцца да 10 ст. У 992 была засн. Полацкая епархія, у пач. 11 ст. — Тураўская. Самым стараж. храмам на бел. землях лічыцца царква Маці Божай, узведзеная ў 1001 у Друцку. Першы хрысціянскі манастыр быў засн. ў стараж. Ізяслаўлі (сучаснае Заслаўе). У ВКЛ закладваліся характэрныя для бел. грамадства традыцыі поліканфесійнасці і рэліг. талерантнасці, у культ. і рэліг. жыцці былі прадстаўлены як хрысціянскія веравызнанні (*праваслаўе, каталіцызм, пратэстантызм*), так і інш. Р. (*іўдаізм, іслам*). У ВКЛ праваслаўная царква дамінавала на працягу 13—16 ст. Распаўсюджванне ўплыву рымска-каталіцкага касцёла на бел. землях пачалося з 13 ст. Вял. кн. Ягайла прыняў каталіцкую веру, засн. Віленскае епіскапства. Люблінская унія 1569 спрыяла актыўнаму пашырэнню каталіцкага веравызнання на бел. землях. У выніку Брэсцкай уніі 1596 праваслаўны епіскапат ВКЛ прызнаў вярхоўную ўладу папскага прастола (гл. *Уніяцкая царква* ў Беларусі). Уніяцтва параўнальна хутка распаўсюдзілася ў ВКЛ і ў 17—18 ст. стала гал. веравызнаннем. З уваходжаннем Беларусі ў склад Рас. імперыі каталіцкі касцёл страціў свае дамінуючае становішча. У 19 ст. католікі складалі каля 20% насельніцтва Беларусі. З сярэдзіны 17 ст. на тэр. Беларусі пачалі сяліцца стараабраднікі (гл. арт. *Стараабрадніцтва*), буйнейшым пасяленнем якіх было мястэчка Ветка (цяпер горад). Пратэстанцкія кірункі Р. (кальвінізм, лютэранства і інш.) з'явіліся на бел. землях у 1-й пал. 16 ст. (гл. арт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Рэфармацыя*). У пач. 20 ст. ў выніку дзейнасці ням. і англ. прапаведнікаў у Беларусі атрымалі распаўсюджанне баптызм, евангельскае хрысціянства, адвентызм. Пасля Кастр. рэв. 1917 у адпаведнасці з дэкрэтам Савета Нар. Камісараў ад 23.1.1918 «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» дзяржава была абвешчана секулярнай, царк. маёмасць нацыяналізавана. Ва ўмовах Грамадз. вайны адносіны сав. дзяржавы да Р. былі палітызаванымі, пачалося масавае закрыццё цэркваў, касцёлаў і манастыроў. У першыя пасляваен. гады актывізаваўся працэс стварэння на тэр. Беларусі пратэстанцкіх абшчын, аднак у канцы 1920-х гг. многія з іх перайшлі на нелегальнае становішча. Да 1927 у БССР былі закрыты малітоўныя дамы евангельскіх хрысціян, баптыстаў і інш. пратэстанцкіх кірункаў. У выніку дзейнасці рээмігрантаў з Амерыкі, замежных місій у 1920 — 30-я гг. на тэр. Зах. Беларусі пашырыліся евангельскае хрысціянства, баптызм, пяцідзясятніцтва, адвентызм і інш. Актыўнае адраджэнне ўплыву праваслаўнай царквы і інш. рэліг. канфесій пачалося ў Беларусі ў 2-й пал. 1980-х гг. Адбылася рэарганізацыя структуры праваслаўнай царквы. На Архірэйскім саборы 1989 было прынята рашэнне аб стварэнні Бел. экзархата Рус. праваслаўнай царквы на чале з мітрапалітам Мінскім і Гродзенскім *Філарэтам*. У 1990-я гг. значна павялічыўся ўплыў традыц. і новых пратэстанцкіх кірункаў (хрысціян поўнага евангелля, новаапостальскай царквы і інш.), колькасць пратэстанцкіх абшчын у Беларусі павялічылася ў 3,5 разы. Іўдзейская Р. прадстаўлена на бел. землях з 14 ст. У гарадах і мястэчках будаваліся *сінагогі*, адкрываліся іўдзейскія навуч. установы. У асноўным яўрэі спавядалі артадаксальны іўдаізм, але меў распаўсюджванне і хасідызм. Пасля Вял. Айч. вайны дазвол на дзярж. рэгістрацыю атрымалі абшчыны ў Мінску і Бабруйску. Значнай падзеяй у культ. жыцці Беларусі стала адкрыццё ў 1989 у Мінску Цэнтра яўр. культуры. Адной з Р. на тэр. Беларусі з'яўляецца іслам. Першыя пасяленні татар-мусульман, запрошаных на службу ў ВКЛ, з'явіліся ў канцы 14 ст. З 1990-х гг. рэліг. жыццё мусульман у Беларусі значна актывізавалася.

Па дадзеных Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей у 2015 у Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 26 рэліг. канфесій і кірункаў. Агульная колькасць рэліг. арг-цый — 3488, у т.л. 173 арг-цыі агульнаканфесійнага значэння (рэліг. аб'яднанні, манастыры, місіі, брацтвы, сястрыцтвы, духоўныя навуч. установы), 3315 рэліг. абшчын. Дзейнічаюць 2618 культавых будынкаў (245 будуюцца), працуюць 3116 свяшчэннаслужыцеляў. Бел. праваслаўная царква мае 1643 прыходы, 15 епархій, 7 навуч. устаноў, 35 манастыроў, 15 брацтваў, 10 сястрыцтваў. Дзейнічаюць 1535 праваслаўных храмаў (194 будуюцца). Рымска-каталіцкая царква ў Рэспубліцы Беларусь аб'ядноўвае 4 епархіі, 491 абшчыну, 5 духоўных навуч. устаноў, 11 місій і 9 манастыроў. Дзейнічаюць 488 касцёлаў (36 будуюцца). Пратэстантызм у Рэспубліцы Беларусь прадстаўлены 14 кірункамі, 1057 абшчынамі, 21 аб'яднаннем, 22 місіямі і 5 духоўнымі вучэбнымі ўстановамі. Зарэгістраваны 33 рэліг. абшчыны стараабраднікаў, якія маюць 27 культавых будынкаў. У трох іўдзейскіх рэліг. аб'яднаннях налічваецца 52 абшчыны, з якіх 10 маюць аўтаномны статус, 9 культавых будынкаў. У Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць 25 мусульманскіх рэліг. абшчын, у т.л. 24 суніцкія і 1 шыіцкая, 7 культавых будынкаў, у Мінску будуецца мячэць. Ажыўленне рэліг. жыцця ў Беларусі ў 1990-я гг. прывяло да з'яўлення груп паслядоўнікаў новых рэліг. рухаў, сярод якіх Міжнар. т-ва Свядомасці Крышны, Вера Бахаі, Сусв. духоўны ўн-т Брахма Кумарыс, Царква Аб'яднання, Царква саенталогіі, Сахаджа-Йога і інш. Некаторы ўплыў мае Царква апошняга запавета, паслядоўнікі вучэння П.Іванова, неаязычніцкія групы. Пэўны інтарэс праяўляецца да тэасофскіх і антрапасофскіх вучэнняў, «Жывой этыкі» Рэрыхаў. У 2000-я гг. ў грамадскай свядомасці жыхароў Беларусі істотна змяніліся адносіны да Р., паглыбілася разуменне яе ролі ў грамадстве, уплыву на культуру, мараль. У прынятым у 2002 Законе Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» пацвярджаецца права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, роўнасць перад законам незалежна ад адносін да Р., неабходнасць спрыяння дасягненню ўзаемаразумення, цярпімасці і павагі рэліг. пачуццяў грамадзян. Поліканфесійная супольнасць Рэспублікі Беларусь, паліт. і культ. эліта дзяржавы дабілася вялікіх поспехаў у стварэнні перадумоў і ўмоў для супрацоўніцтва і здзяйснення талерантнага міжканфесійнага дыялогу ў краіне.

*В.Р.Языковіч.*

**РЭЛІГІЯЗНАЎСТВА**, кірунак сацыяльна-гуманітарных ведаў, навука аб заканамернасцях узнікнення, гісторыі, сацыяльнай і культурнай ролі рэлігіі. Р. сфарміравалася ў 2-й пал. 19 ст. Перадумовай станаўлення Р. з'явілася развіццё філасофіі рэлігіі ў працах філосафаў антычнасці, Сярэдневякоўя, Новага і Навейшага часу. Развіццё Р. адбывалася на аснове выкарыстання розных метадаў сацыяльна-гуманітарных ведаў, дасягненняў у галіне псіхалогіі, параўнальнай лінгвістыкі, сацыялогіі, герменеўтыкі і інш. навук. Сучаснае Р. вывучае гіст. і параўнальны аспекты рэліг. традыцый (гісторыя рэлігіі), уздзеянне рэліг. аб'яднанняў і каштоўнасных сістэм на сац. працэсы (сацыялогія рэлігіі), уплыў рэліг. традыцый на фарміраванне і жыццёвыя праявы асобы, характар міжасабістых адносін у рэлігійных групах (псіхалогія рэлігіі), структуру і канкрэтна-гіст. праявы ўніверсальных рэлігійных з'яў (фенаменалогія рэлігіі), уплыў рэліг. традыцый на культуру (антра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ